Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj Historyi
Fond 9М64(3а)

СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РБ М.І.ГРЫБУ.

Камісіі па вывучэнню прапаноў грамадскіх арганізацый і асобных грамадзян па дзяржаўнай сімволіцы.

Каб уносіць якую-небудзь прапанову па гэтаму пытанню трэба быць нацыянальнасвядомым чалавекам,патрыётам сваей Бацькаўшчыны,Дзяржавы,знаць запраўдную яе гісторыю,знаць гісторыю сімволікі другіх дзяржаў.У гэтым пытанні дзейнічаць па прынцыпу: падабаецца - непадабаецца нельга.І усеагульнай згоды у ім ніколі не будзе. Гэта пытанне не вырашае ніякі рэферэндум,таму што у масе сваей людзі некампетентны у ім,а будуць галасаваць па прынцыпу:падабаецца-непадабаецца.

У самай дэмакратычнай,у самай патрыятычнай краіне свету заўсёды знойдуцца асобныя "патрыёты",якім свое дзяржаўныя сімвалы непадабаюцца і яны прапанавалі бы "лепшыя" :больш нацыянальныя,больш патрыятычныя,больш аб'ядновываючыя нацыю і г.д.

Каб гэтага і іншага свавол[л]я не было,дзяржаўная сімволіка прынімаецца Канстытуцыей,а гэта азначае,што яе павінны паважаць усе грамадзяне Краіны,не залежна ад таго як яны адносяцца к ей у душэ,сваім розумам.

Добра вядома(хто гэта знаіць),што няма краіны свету,асаблівa калі узяць вялікія краіны,дзяржаўныя сімвалы якіх не былі бы запятнаны крывей сваіх,а тым больш чужых,народаў.У гэтай крывавай справе як ніхто прыуспелі расійскія нацыянал-імперыялісты і бальшэвікі.Толька па афіцыйным дадзяным за 3/4 апошняга стагоддзя загублена 60 міліёнаў чалавек.Пад Расійскімі дзяржаўнымі сімваламі і цяпер у разных кутках льецца кроў,канешне за "законнасць","правапарадак",супраць "бандфарміраванняў","агалцелых нацыяналістаў" і г.д.Ну,а бальшэвіцкія чырвоныя знамёны - гэта адна кроў нявіноўных людзей.Серп і молат - выдатныя прылады працы,але ж працуючыя у поце твару пад такім казалась бы святым сімвалам,гінулі ад працы,пухлі ад голада,атрымлівалі галачкі,крыжыкі і палачкі за сваю працу,у лепшым выпадку 15% ад себякошту,што прадаўжаюць"зарабляць" і цяпер па ласцы былых бальшэвікоў-катаў,а цяпер - "дэмакратаў".

ДЗЯРЖАЎНЫЯ СІМВАЛЫ ПАГАНЯЦЬ,ЗНЯВАЖАЮЦЬ,ПАЧКАЮЦЬ КРЫВЁЙ НІКЧЭМНЫЯ ПАЛІТЫКІ,А САМІ СІМВАЛЫ ТУТ НЯВІНОЎНЫ,ЯНЫ НЕЖЫВЫЯ!

Старажытнасць сімвалаў сьведчыць аб старажытнасці дзяржавы,яе гістарычнай законнасці.А гэта немалаважна!

Я,напрыклад,дабавіў бы каля дрэўка бела-чырвона-белага нашага сцяга зялёны беларускі арнамент."Пагоню" зрабіў бы ордэнам,ці сімвалам беларускай арміі.А дзяржаўным сімвалам зрабіў бы "...сьвяток радзімы васілька",такі мілы беларускаму сэрцу.

vytoki.net

Але ж з такім жа поспехам на высокую пасаду дзяржаўнага сімвала(герба)РБ могут прэтэндаваць павамання жывёліны,што на нашых гербах, асабліва зубр,шматлікія птушкі,асабліва бацян,які нічуць ня кужэй разных сімвалаў-арлоў,крыж Еўфрасіні Полацкай .Смешна,але ж нас называюць і краінай агуркоў.Дык може і агурок зрабіць нашым дзяржаўным сімвалам!?

Кажуць,што "Пагоня" - гэта літоўскі (правільней - жамойцкі)герб На самай справе гэта наш герб.Ды паміж іхнім і нашым гербамі,як і паміж гербамі-арламі ёсць розніца.

Такім чынам,цяпер трэба не прыдумываць другія дзяржаўныя сімвалы для РБ,а выхоўваць у грамадзян пашану к нашым гістарычным,канстытуцыйным сімвалам,прапагандаваць і распаўсюджываць іх.Не сакрэт,што на хлебе РБ жывуць людзі,якія ненавідзяць яе сімвалы,але і сваю карміцельку.Яны стварылі і вядомыя антыдзяржаўныя "грамадскія" арганізацыі.

Згаданая вышэй камісія па дзяржаўнай сімволіцы,пасля таго,як яна прынята канстытуцыяй, - непатрэбна і нават шкодная для стабілізацыі становішча у Рэспубліцы Беларусь.

Яе неабходна РАСПУСЦІЦЬ!

220082,МІНСК
вул.Прытыцкага,д.38,кв.19
Іван Міронічык
прафесар

Мінск
20.XII.94г.

vytoki.net